# ЧАРГОВАЕ ПАСЯДЖЭННЕ САВЕТА ЎНІВЕРСІТЭТА

Напрыканцы сакавіка адбылося чарговае пасяджэнне савета ўніверсітэта, на якім прарэктар В.В. Багатырова выступіла з дакладам аб выніках пазабюджэтнай дзейнасці і аказанні платных паслуг у 2016 годзе. У прамове было адзначана, што аб'ём даходаў нашай ВНУ ад пазабюджэтнай дзейнасці адпавядае планавым паказчыкам. Валянціна Васільеўна адзначыла таксама, што ва ўніверсітэце была праведзена першасная работа па ажыццяўленні маркетынгавых даследаванняў рынку адукацыйных і іншых паслуг Віцебскага рэгіёна і міжнароднага рынку, па пашырэнні асартыменту паслуг, выяўленні і развіцці новых спажывецкіх іх якасцей. Сярод задач, якія неабходна рэалізаваць у галіне пазабюджэтнай дзейнасці і аказанні платных паслуг у 2017 годзе, сфармуляваны наступныя: арганізацыя работы цэнтра паслуг універсітэта, пашырэнне рынку экспарту адукацыйных паслуг, распрацоўка і рэалізацыя рэкламнай прадукцыі, узмацненне работы з рэкрутынгавымі агенцтвамі, выкананне планавых паказчыкаў па аказанні платных паслуг у памеры 104% ад фактычнага аб'ёму за 2016 год і інш.

На пасяджэнні адбылося таксама выбранне на пасады загадчыка кафедры і прафесара. Так, на пасаду загадчыка кафедры алгебры і методыкі выкладання матэматыкі быў выбраны М.Ц. Вараб'ёў, загадчыка кафедры прыкладнога і сістэмнага праграмавання – С.А. Ермачэнка, загадчыка кафедры дызайну – В.У. Кулянёнак, загадчыка кафедры літаратуры – В.В. Лапацінская, загадчыка кафедры агульнага і рускага мовазнаўства – Г.М. Мезенка, загадчыка кафедры педагогікі – Н.А. Ракава, загадчыка кафедры выяўленчага мастацтва – А.А. Сакалова. На пасаду прафесара кафедры хіміі былі выбраны Я.Я. Аршанскі і А.А. Данчанка, прафесара кафедры агульнага і рускага мовазнаўства – А.Ю. Муратава.

Было прынята рашэнне аб хадайніцтве перад Вышэйшай атэстацыйнай камісіяй Рэспублікі Беларусь аб прысваенні вучонага звання дацэнта па спецыяльнасці «Права» П.Г. Шэленгоўскаму, кандыдату юрыдычных навук, дацэнту кафедры гісторыі і тэорыі права.

**Г.К. СЕМЯНЬКОВА,**
**вучоны сакратар савета ўніверсітэта.**